Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 16 Вільня, Нядзеля 24 Красавіка 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл. на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

На беларускім школьным фронце.

Сумна на гэтым фронце. Польскі ваяўнічы нацыяналізм усьцяж націскаў на беларускую школу і нямілaсэрна яе ніштчыў.

Пачаткі беларускай школы сягаюць 1906 г., калі пад кіраўніцтвам Якуба Коласа (К. Міцкевіча), слаўнага беларускага паэта і пісьменьніка, а так-жа Яз. Лёсіка, ведамага беларускага філёлёга, з прафэсіі вучыцялёў, засноўваўся тайны вучыцельскі гуртоk, дзеля тайнага навучаньня беларускіх дзяцей у іх роднай беларускай мове.

Выбухнула вайна і на Беларусь прышлі немцы. Ідэя будаўніцтва роднай школы ўзноў ускрасае. Паўстае да 350 беларускіх пачатковых школ і бел. вучыцельская сэмінарыя ў Сьвіслачы, Ваўкавыскага пав.

Пасьля немцаў, беларускія зямлі, разам з Менскам, у 1919 г. займаюць палякі. Паўстае так званы „Урад Ус-х деіх Зямель", які адразу пачынае наступ на нашыя пачатковыя школы і ніштчыць іх дзеяньня, у тым ліку і вучыцельскую сэмінарыю ў Сьвіслачы.

У 1920 г., пасьля польска-бальшавіцкай вайны, палякі, каб утрымаць пры Польшчы Віленшчыну, ствараюць як нешта пераходнае, так зв. „Сярэднюю Літву". У гэтым часе ўзноў паўстае да 200 бел. школ і бел. вучыцельская сэмінарыя ў Барунах, Ашмянскага павету.

Але вось у 1921 г. устанаўляецца сучасная польская дзяржаўная граніца і землі Заходняй Беларусі астаюцца за Польшчай.

Пачынаецца ўзноў націск на беларускія школы. У 1922 г. з гэных 200 бел. школ астаецца толькі 36; рэшту польскія ўлады закрываюць; закрываюць яны ў тым-жа годзе таксама і Беларускую Вучыцельскую Сэмінарыю ў Барунах.

У наступным годзе да гэных школ з мінулага году прыбывае яшчэ адна. Такім чынам у 1923 г. (у сакавіку мес.) ува ўсей Зах. Беларусі існуе 37 бел. пачатк. дзяржаўных школ.

31.VII.1924 г. выходзіць так зв. „устава языковая". Згодна з гэтай уставай беларусы складаюць дэклярацыяў на 412 бел. школ. Польскія аднак улады да заснаваньня гэтых школ не дапускаюць. Больш таго — яны 7.I. 1925 г. выдаюць „інструкцыю", як гэтую ўставу праводзіць у жыцьцё. Гэта інструкцыя уводзіць цэлы рад труднасьцяў пры адкрыцьці бел. пачатк. дзярж. школы і развой яе ўзноў спыняе.

У часе ад 1925 да 1928 г. на беларускіх землях у Польшчы існуе толькі 6 школ, ды ўжо не беларускіх, а „утраквістычных" (польска-беларускіх).

У 1928 г. ўсіх беларускіх дзяржаўных пачатковых школ існуе 65: 21 беларуская і 44 польска-беларускія.

Гэткі, з малымі зьменамі, лік бел. дзярж. пачатк. школ трывае да 1931 г., у якім налічваецца іх 63: 22 школы беларускія і 41 польска-беларуская.

Пры гэтым трэба ведаць, што ўсе гэтыя школы — яны толькі завуцца беларускія, ці польска-бел., бо фактычна яны ўжо польскія, фактычна польскі нацыяналізм бел. пачатковую школу ўжо зьнішчыў цалком.

Аднак для прычын палітычных у 1930 г. ў Вільні закладаецца яшчэ Вучыцельская польска-беларуская Сэмінарыя ім. Фр. Багушэвіча.

Прад гэткім наступам польскага нацыяналізму не магло разьвіцца так-жа і бел. школа прыватная. Ды-й трудна вымагаць ад бел. селяніна, каб ён плаціў на дзяржаўную школу падаткі і аднчасна—на школы прыватныя. Зрабіць гэта ён ня ў сілах. А дзе і ва гэта здабываўся, там спыняў яго асьветныя імкненьні той-жа польскі нацыяналізм.

У 1928 г. існуюць 4 школы бел. прыватныя, а сяньня ўжо толькі адна, у Шаўлянах, Браслаўскага пав.

Дый у будучыне надзеі на прыв. бел. школу мала. У сакавіку месяцы 1932 г. Варшаўскі Сойм выдае закон аб прыватных школах. Закон гэты так шмат дае магчымасьці ўмешваньня ў справы заснаваньня прыватных школ уладам школьным і паліцыйным, што надзеі на прыватныя школы мусяць быць дужа сумныя.

Будуе таксама беларус і сваю сярэднюю школу. Паўстаюць калейна па сабе беларускія гімназіі: у Будславе, у Вільні, у Гарадку — Радашкавічах, у Нясьвіжы — Клецку і Навагрудку. Але той-жа польскі націск робіць сваё і тут. Сяньня існуюць, напалову галадуючы, ужо толькі дзьве бел. гімназіі: у Вільні і ў Навагрудку. Дый і гэтыя ці астануцца? У пачатку сакавіка 1932 г. Соймам прыняты закон аб перабудове гімназіяў і вуч. сэмінарыяў. Закон гэты зможа даць магчымасьць „перабудовы" і нашых гімназіяў.

*

Гэтак сумна прадстаўляюцца беларускія справы на школьным фронце. — А вось і апошнія весьці і чуткі з гэтага фронту.

Дзярж. польска-беларуская Вучыцельская Сэмінарыя ім. Фр. Багушэвіча ў Вільні канчае школьны год і зачыняецца. Два гады таму Бел. Інстытут Гасп. і Культуры рабіў захады, каб адчыніць *прыватную беларускую* вучыцельскую сэмінарыю. Справа была ўжо на добрай дарозе. У дзяржаўным бюджэце былі ўжо прызнаны патрэбныя сумы. Але „памаглі" справе „свае". Главары польска-беларускай угоды Ант. Луцкевіч і Р. Астроўскі пажадалі гэту справу ўзяць у свае рукі на варунках больш для палякоў дагодных. Урад, ведама, ахвотна на гэта згадзіўся. Р. Астроўскі стаўся дырэктарам успомненай сэмінарыі, але, як бачым, толькі на два гады. Гэта факт.

А вось чуткі. Бел. Навагрудзкая Гімназія быццам з гэтым годам таксама нейкім чынам і нейкім правам мае ліквідавацца і быццам нешта няздобрае з боку польскага мае спаткаць і Бел. Віленскую Гімназію.

Праўда, гэта яшчэ толькі чуткі, але надта магчыма, што сумныя гэтыя чуткі стануцца фактам. А стацца ім фактам дужа лёгка. Ня трэба забывацца, што апошнімі гадамі асаблiва Віленскую Бел. Гімназію цалком апанавалі старонькі палітычнай польска-беларускай угоды, якія дужа выразна карысталіся ей для сваіх *палітычных* мэтаў.

Ясна, што гэткая палітыка беларуска-польскай угоды, якая навет карыстаецца школай, губіць гэтую школу і дапамагае палякам браць яе цалком у свае рукі.

Словам, зусім няружова на беларускім школьным фронце.

Ня гледзячы аднак на гэта беларускі народ і беларускае грамадзянства павінны стойка бараніцца і не павінны падаць духам. Мы мусім жыць і будзем жыць. Калі не дацца нам родная, належная нам, школа і ніштчацца астаткі гэтай школы — дык мы павінны ўзяцца за роднае навучаньне пазашкольнае, хатняе. Беларускі лемантар, кніжка беларуская павінны замяніць нам школу і вывесьці народ на шлях волі і долі. Гэтак было і з іншымі народамі...

З газэт.

Фальшаваньне дакументу.

Горадзенская „Беларуская Думка" (№ 6. 10.IV 1932), якая рэдагуецца няведама кім і надта-ж бязграматна, а выдаецца з тою мэтаю, каб як найболып туманіць беларусаў ды зьбіваць іх з панталыку, зьмяшчае статьцю і аб Акце 25 сакавіка 1918 г.

У гэтай статьці бяграматны пабеларуску пісец проста і сьведама фальшуе маніфэст 25 сакавіка 1918 году, якім абвешчана незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі.

Паўтараць тут абсурдальнае тлумачэньне гістарычнага дакуманту і спорыць з бязграматным пісакам уважаем лішнім, бо гэнае тлумачэньне на столькі глупае, што гэтаму не паверыць і 15-цігадовы беларускі хлапчук.

б.

З беларускага жыцьця.

БХД аб беларусізацыі Царквы. Праваслаўная фракцыя Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі паставіла палаць Мітрапаліту Праваслаўнай Царквы ў Польшчы мэмoрыял, якім зьвернецца ўвага вышэйшых духоўных уладаў на неабходнасьць правядзеньня беларусізацыі праваслаўнай Царквы ў Зах. Беларусі. Да апрацаваньня і падпісаньня мэмoрыялу ўпоўнаважаны абодва віцэ-старшыні БХД (праваслаўныя): Я. Красоўскі і М. Дварэцкі.

Турботы беларускіх угадоўцаў аб Таварыстве Беларускай Школы. Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы ўжо каля году часу намагаецца склікаць агульны сход ТБШ, каб наладзіць нармальную працу Т-ва, але да гэтай пары ўсё не ўдаваляся.

Гэты мамэнт, як даведаемся, „прожондовая" групка А. Луцкевіча таксама не „прамаргала".

Дзеля навязаньня кантакту з сябрамі Галоўнай Управы ТБШ і заахвяраваньня „услуг", групка „прожондовцув" скарыстала з „міратворчай" падстаўной асобы, праз каторую і пачаліся перагаворы. Гэтыя перагаворы давялі і да супольнай „дыплёматычнай" гарбаткі, дзе спаткаліся сябры Галоўнай Управы ТБШ, з прадстаўнікамі „нашых" угадоўцаў. Угадоўцаў на гарбатцы прадстаўляў Р. Астроўскі. Пры шклянцы гарбаткі адбыліся перагаворы ў маштабе дагавораў: — „прожондоўцы" запрапанавалі Галоўнай Управе ТБШ стварыць з імі „коаліцыю", склікаць агульны сход ТБШ і на сходзе гэту „коаліцыю" пацьвердзіць правядзеньнем у Галоўную Управу ТБШ прынамся двух „прожондоўцаў". Каб не дражніць удзельнікаў сходу з правіцыі, „прожондоўцы" быццам абяцалі даць кандыдатаў у Галоўную Управу ТБШ менш скампраматаваных угодай. У гэтай справе, як нас інфармуюць, угадоўцамі быў выкліканы ў Вільню б. сэнатар Уласаў.

Ці Галоўная Управа ТБШ ужо заключыла „коаліцыю" з „прожондовай" групкай Луцкевіча — пакульшто сакрэт, бо і самыя перагаворы адбыліся ў вялікім сакрэце. Аб гэтым зможам даведацца толькі пасьля агульнага сходу ТБШ, які мае адбыцца 12 траўня бел. году.

Адміністрацыйныя ўлады не даюць дазволу на беларускі адчыт. Дня 10 г. м. у гуртку Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Шальцінах, Браслаўскага пав. студ. Я. Малецкі меўся прачытаць публічную лекцыю на тэму „Мэта і заданьне Бел. Інстытут Гасп. і Культуры", але Браслаўскае старацтва на гэтую лекцыю не дало дазволу.

З Польшчы.

Дзьве справы. Ёсьць дзьве справы, якія дражняць польскіх палітыкаў і аб якіх апошнімі часамі шырока пісала польская прэса. Першая справа — гэта турботы польскага ўраду аб пазычцы, а другая — гэта справа канфэрэнцыі 4-ох дзяржаў аб францускім праекце стварэньня саюзу наддунайскіх дзяржаў.

Польскія газэты падаюць з вялікім расчараваньнем аб няўдачах прадстаўнікоў польскага ўраду ў справе пазычкі ў Францыі, бо ў Францыі пачуліся словы: „ані аднаго граша для Польшчы Пілсудзкага“.

Аб другой справе: польскія санацыйныя газэты праз доўгі час намагаліся ўгаварыць, што канфэрэнцыя аб саюзе наддунайскіх дзяржаў бяз учасьця Польшчы гэта доказ, што Польшча ёсьць магутная. Тымчасам выявілася, што Польшчу абмінулі ў канфэрэнцыі не дзеля таго, што яна „магутная“, а проста таму, што ў Францыі зьмяніліся пагляды ў міжнароднай палітыцы, якія адгараджваюць Польшчу ад Францыі.

Закон аб асадніцтве, аб якім мы пісалі, ужо абвяўлены ў „Дзенніку Устав“ і мае абавязуючую сілу. Дзеля гэтага трэба спадзявацца, што закрапленьне старога і насаджываньне новага асадніцтва пачнецца скора.

Зьніжка паштовай аплаты. Ад дня 15 г. м. скасаваны даплаты паштовыя на безработных. Дзеля гэтага новая тарыфа будзе такая: звычайнае пісьмо — 30 гр., паштоўка — 20 гр., заказное (полецонэ) — 90 гр.

Школы толькі для багатых. Як ведама, польскі Сойм пацьвердзіў урадавы праект школьнай рэформы ў Польшчы. Паводле гэтага праекту, як падаюць польскія газэты, сярэднія школы будуць толькі ў большых гарадох і будуць такія дарагія, што змогуць у іх вучыцца дзеці толькі багатых бацькоў.

Забастоўка земляроб. работнікаў. Дня 19 г. м. адбылася ва ўсей Польшчы забастоўка земляроб. работнікаў. Дворныя парабкі баставалі ў 627 фальварках. Баставала агулам 25 тысяч земляроб. работнікаў. Гэная забастоўка адбылася толькі ў цэнтральнай Польшчы. У ваяводзтве Пазнанскім баставала — 17.120 работнікаў у 443 фальварках, у ваяводзтве Паморскім — 5 тысяч работнікаў у 120 фальварках, у ваяв. Варшаўскім — 1200 работнікаў у 50 фальварках і інш. Агулам забастоўка не ўдалася. У некаторых фальварках баставалі толькі адну гадзіну. У нашым краю (Зах. Беларусь) забастоўкі ня было.

Забурэньне безработных. У панядзелак 18 г. м. у Гродзіску безработныя ў ліку больш 300 асоб сабраліся каля магістрату і дамагаючыся працы і хлеба, хацелі ўварвацца ў магістрат, але паліцыя заступіла дэманстрантам дарогу і не дапусьціла. Безработныя абкідалі паліцыю каменьнямі. Паліцыя зарэагавала аружжам. У выніку—адзін безработны ранены ў бруха.

З заграніцы.

Ліквідацыя баявых аддзелаў Гітлера ў Нямеччыне. Пасьля выбараў прэзыдэнта ў Нямеччыне стала ясным, што ўплывы народных соцыялістаў у краю спалавініліся з сваімі працаўнікамі. Пры гэтым усім было ведама, што армія Гітлеравых баявых партыйных аддзелаў дайшла да такой колькасьці і такога псыхічнага стану, што ўжо і сам Гітлер ня мог утрымаць яе у бяздзейнасьці. Гэта армія пхала і самога Гітлера да дзяржаўнага перавароту.

Апынуўшыся ў такім палажэньні, нямецкі ўрад быў прымушаны выбіраць адно з двух: або чакаць наступленьня, або самому наступаць. З гэтых двух сучасны ўрад выбраў другое і павёў атаку на Гітлера.

Паноўна выбраны прэзыдэнт Гіндэнбург выдаў дэкрэт, які разьвязвае ўсе баявыя аддзелы Гітлера. Пасьля падпісаньня 13 г. м. прэзыдэнтам гэтага дэкрэту, у працягу гадзіны часу, ва ўсей Нямеччыне была праведзена рэвізія ў гітлераўскіх арганізацыях і апячатаны памяшчэньні гітлераўскіх баявых аддзелаў. У часе рэвізіі сканфіскавана многа аружжа і іншых матэр'ялаў, належачых да гэтых аддзелаў. Пасьля гэтага разгрому выявілася, што Гітлер меў 400-тысячную армію азброеных штурмоўцаў.

Гітлер аднак ня падае духам і запавядае барацьбу. У гутарцы з прадстаўнікамі прэсы ён заявіў, што: штурмовыя аддзелы, якія ўрад уважае пасьля дэкрэту прэзыдэнта за няісную́чыя, скора вернуцца назад да свайго заданьня, а як вернуцца, то 400 тысячная гэта армія пабольшыцца да 600 тысяч. Далей Гітлер заявіў, што гэты дэкрэт прэзыдэнта моцна падкрапіў яго, Гітлера, уплывы ў народзе, а дзеля гэтага ў выбарах у прускі сойм, якія скора адбудуцца, ён здабудзе 160 мандатаў.

Газэты падаюць, што камандзанты гітлераўскіх баявых аддзелаў ведалі наперад аб намярэньнях ураду, а дзеля гэтага важнейшыя дакуманты і матэр'ялы яшчэ прад рэвізіяй пахавалі.

У зьвязку з разгромам гітлераўскіх баявых аддзелаў у Нямеччыне, газэты падаюць, што Гітлер мае быццам перанясьці свой галоўны штаб у Гданск, куды мае так-жа перавесьці і галоўны мабілізацыйны апарат баявых аддзелаў сваей арганізацыі.

Словам, сучасны ўрад Нямеччыны канчальнай перамогі над Гітлерам яшчэ не асягнуў. Чым закончыцца распачатая ўрадам барацьба з арганізацыяй Гітлера, пакажа будучыня.

Канфэрэнцыя аб разаружэньні. Пасьля вялікоднага оддыху, дня 11 г. м. ізноў сабралася ў Жэнэве канфэрэнцыя, на якой прадстаўнікі розных азброеных дзяржаў адны другіх забаўляюць прамовамі аб разбраеньні. Пасьля вялікоднага аддыху, добра забавіў эўрапэйскіх слухачоў прадстаўнік Зл. Шт. Амэрыкі, які запрапанаваў зьнішчыць: цяжкую артылерыю, танкі і хэмічныя ваенныя апараты. Ведаючы, што з гэтага нічога ня будзе, з амэрыканскім „міратворцам“ згадзіліся і прадстаўнікі: Англіі, Італіі і Швэцыі.

На Далёкім Усходзе ўсё мелецца. Японска-кітайскія перагаворы вельмі вялыя. Кітайцы і японцы ня хочуць уступаць адны другім. Зрыву перагавораў і ўзнаўленьня вайны нанова чакаюць з дня на дзень.

На лініі Ўсходня-кітайскай чыгункі была спроба ўзарваньня мосту на рацэ Джунгары. Дзеля таго, што вінаватых не знайшлі, савецкія газэты ўзваліваюць віну на „белагвардзейцаў,“ якія праз гэта хацелі пасварыць Японію з ССРР., даказваючы, што мост узарвалі бальшавікі.

Камуністы выключаюць з партыі камуністаў. Сябра камуністычнай партыі Украіны—Чэрняк выдаў кніжку, у якой апісвае свае спасьцярогі з падарожы па Эўропе, між іншым аб жыцьці работнікаў у капіталістычных дзяржавах. З гэтага апісаньня выглядае, што работнікам часта лепш жывецца ў дзяржавах капіталістычных, як у „сваёй“ пралетарскай дзяржаве — С.С.Р.Р. За гэты „праступак“ Чэрняка камуністы выключылі яго з партыі.

Бальшавіцкае войска на Далёкім Усходзе. Паводле японскіх вестак, Саветы на пагранічча Манджурыі цяпер трымаюць каля 160 тысяч войска прывезенага з Расеі, а апрача гэтага змабілізавалі на ўсякі выпадак каля 600 тысяч сялян у Сібіры.

На вайну будуць браць і жанчын. Італьянскі ўрад выдаў закон, у якім сказана, што ў выпадку вайны будуць змабілізаваны на вайну і жанчыны.

Новыя парадкі ў калгасах.

„Укараненьне ў калгасную вытворчасьць зьдзельшчыны ацэненай у працаднёх; ліквідацыя ўраўнілаўкі і абязьлічкі; правільнае разьмяркаваньне даходаў і ўраджаю, аснованае на колькасьці і якасьці працы кожнага калгасьніка; правільная расстаноўка і скарыстаньне рабочай сілы; своечасовая і поўная здача (продаж) дзяржаве таварных лішкаў —вось задача парторганаў саўгасаў і каўгасаў.

„Зьвязда“ 30.X 31.

Дагэтуль калгаснае жыцьцё ў Сав. Беларусі было наладжана зусім проста: гаспадары пад прымусам, або спадзяючыся лягчэйшага жыцьця, выносілі пастанову аб пераходзе ў калектыў (калгас). Зараз ім прысылалі інструктара, грашавую падмогу, машыны і працуйце. Аднак неарганізаваная праца, якая йшла сама сабою, так зв. „самацёкам,“ не прывадзіла да пажаданых рэзультатаў. Пасьля пару гадоў „працы“ ў гэтакім калгасе гінула жывёла, псаваліся машыны, праядаліся грошы і камуністычная дзяржава ня толькі ня мела ніякай карысьці з таго калгасу, але яшчэ трэба было памагаць калгасьнікам, каб ня згінулі з голаду.

Гэта сьцьвярджае нават і савецкая прэса. І так „Сав. Беларусь“ (27.XI.31) у перадавіцы між іншым гэтак піша: „Мы маем усё яшчэ нізкі выхад таварнай прадукцыі, нізкую ўраджайнасьць, нізкую ўдойлівасьць, зусім нізкі працэнт выхаду таварных сьвіней, значнае асяданьне таварнай прадукцыі ў самых калгасах, шырока распаўсюджаныя спажывецкія настроі, выпадкі рвацтва і г. д. Яшчэ надзвычайна дрэнна арганізавана праца і на нізкім узроўні знаходзіцца працоўная дысцыпліна ў калгасах“.

Вылічыўшы ўсе прычыны заняпаду калгасаў, „Сав. Беларусь“ у тым-жа нумары пераходзіць да выказваньня ўсіх спосабаў, якімі можна падняць вытворчасьць калгасаў. „Сав. Беларусь“ падае пры гэтым даўзёрную пастанову ЦК. камуністычнай партыі, якая ўсебакова разглядае балячкі калгаснага жыцьця і падае лекі і спосабы, як яго направіць.

Першым спосабам направы калгаснага жыцьця будзе, паводле інструкцыі Ц. К., *ліквідацыя падзёншчыны, а ўводжаньне зьдзельшчыны*. Дагэтуль кожны калгасьнік выходзіў на работу падзённа і за кожны дзень—ці ён зрабіў што, ці нічога, ці адрабіў добра ці дрэнна—давалася на яго сям'ю пэўная колькасьць прадуктаў. Нават калі ў сям'і быў адзін работнік, а едакоў (малых і старых) было болей, то ўраджай дзяліўся не паводле работнікаў, а паводле едакоў. Цяпер-жа, на аснове новага распараджэньня, падзёншчына касуецца, а уводзіцца зьдзельшчына. Зьдзельшчына разумеецца так, што ўлады калгасаў вызначаюць кожнаму работніку пэўную колькасьць працы, напр. узараць столькі і столькі поля, абмалаціць столькі і столькі коп збожа, пры гэтым вызначаюць, што за гэту работу будзе залічаны адзін дзень працы, за тую два дні працы і г. д. Зробіш акуратна гэтую работу, маеш залічаныя дні працы, або так званыя „працадні,“ а ня зробіш, —нічога табе не залічаць і калі прыдзе падзел прадуктаў, то нічога не атрымаеш. Калі-ж нехта добра адрабіў назначаную работу, то ўпісваюць яму ў рабочую кніжку адробленыя працадні і паводле гэтых працаднёў выдаюць прадукты. Пры гэтым касуецца ўраўнілаўка ў выдаваньні прадуктаў паводле едакоў: ня той гаспадар атрымлівае болей прадуктаў, каторы мае болей едакоў у хаце, а той, каторы здабыў для сябе болей працаднёў. Пры гэтакім парадку дзеці і старыкі, якія ня могуць працаваць і здабываць для сябе „працаднёў“, не атрымліваюць нічога. У пастанове ЦК. КПБ. вельмі срога сказана, што „*не павінна быць ніводнага выпадку разьмеркаваньня даходаў па ядацкім або сямейным прызнаку, трэба рашуча выкрываць перад калгаснымі масамі кулацкую сутнасьць ядацкага прынцыпу, які вядзе да развалу калгасу.*“ („Сав. Беларусь“ 27.XI.31) Значыць — не паводле едакоў дзеліцца ўраджай, а паводле „працаднёў.“

Другім спосабам ратаваньня калгасаў ёсьць *ліквідацыя абязьлічкі*. Што такое абязьлічка? Дагэтуль быў такі парадак, што ў калгасе ніхто ня меў вызначанае сабе часткі калгаснае маемасьці. Усё было пад наглядам усіх. І гэта была так зв. абязьлічка. „Сав. Беларусь“ (27.XI.31) аб абязьлічцы так піша: „зайдзеце ў любую калгасную стайню – і калі там брудна, калі коні не напоены і не накормлены, калі да пачатку сяўбы, або ў канцы ўборкі сьвецяцца рэбры — ведайце: тут пануе абязьлічка, тут пануе дробна-буржуазная стыхія, тут калгасныя канюхі разглядаюць коней, як чужое дабро, а сваю работу, як работу на нейкага гаспадара.“

„Зайдзеце ў любы калгасны склад сельска-гаспадарчых машын — і калі вы ўбачыце там, як іржа есьць машыны, як валяюцца кінутыя абы куды: плуг, бароны, сеялкі, веялкі і г. д.—ведайце, што і тут абязьлічана праца абязьлічана адказнасьць, тут не пачата работа па стварэньні новай грамадзкай дысцыпліны.“

Вось-жа дзеля гэтых прычын касуецца абязьлічка, а заводзіцца новы парадак: кож-

З краю.

Польска-савецкі пагранічны дагавор. Польска-бальшавіцкія перагаворы ў справе рэгуляцыі ў прыгранічнай паласе ўжо кончыліся. На гэтых перагаворах дагаварыліся, што:

1) начальнікі пагранічных участкаў абедзьвюх старон будуць мець права, у патрэбе, даваць пропускі жыхарам прыгранічнай паласы. Пропускі гэныя даюць права пераходзіць граніцу і аставацца на другім баку граніцы праз 3 дні;

2) у прыгранічных рэках і вазёрах можна лавіць рыбу тым асобам, якія на гэта дастануць дазвол ад начальнікаў участкаў;

3) жыхары прыгранічнай паласы маюць права асушаць балоты і праводзіць усялякімі спосабамі мэліорацыю;

4) усе пагранічныя споры разглядаць будзе польска савецкая камісія.

Дагавор гэны абавязвае ад 15 г. м.

Разводзьдзе на Палесьсі. Рака Прыпець і іншыя рэчкі на Палесьсі, напоўніўшыся вясеньняй вадой, разьліліся ўва ўсей ваколіцы. Найбольш грозна разьліліся рэчкі ў паветах: Пінскім, Столінскім, Камень-Кашырскім і Пружанскім. У паветах Пінскім і Столінскім вадой заліта каля 40 асельляў, зьнішчаны пасевы і закапаная ў ямах бульба, пазрываны масты і паразрываны грэблі. Паўдзённая часьць Пінскага і Столінскага пав. заліты сусім вадой і выглядаюць, як вялікае возера. Давідгарадок заліты: — затоплена 23 вуліцы і каля 2000 дамоў.

Усячына.

Выбух вульканаў. У паўдзённай Амэрыцы апошнімі часамі выбухнулі разам аж тры вульканы: Дэскавэсадо, які знаходзіцца на граніцы Аргентыны і Чылii, Ляс Эхэрас і Тінгіріка. Гэтыя вульканы да апошняга выбуху ўважаліся за пагасшыя.

Ад выбуху вульканаў, стаўпы дыму сягаюць аж да хмараў, а грахатаньне пад зямлёй чугно на некалькі сот кілёмэтраў кругом. Мястэчкі і ўсе людзкія асельлі, якія знаходзіліся ў ваколіцах гэтых вульканаў, згінулі. Усялякая камунікацыя з ваколіцамі вульканаў перарвана і дзеля гэтага няведамы лёс тамашніх людзей. У ваколіцах Дэскавэсадо пануюць сільныя маразы. Вульканы ўвакруг на некалькі сот кілёмэтраў засыпалі зямлю попелам на 16 сантым. грубіні. У Паўдзённай Аргентыне пасьля выбуху вульканаў было землятрасеньне. У некаторых мясцох патрэскала зямля і ў ёй парабіліся шчыліны даўжынёй на некалькі кілёмэтраў. Дымам пакрылася ўся сярэдняя Амэрыка. Паветра сталася да таго цяжкое, што ня можна дыхаць. Паніка і жах агарнулі цэлы край.

На востраве Хуан Фарнандос, на якім жыў Робінзон Крузо, таксама было землятрасеньне, ад якога востраў раздваіўся на дзьве часьці. Мястэчка Малярк згінула з паверхні зямлі.

Хмары дыму і попелу з Амэрыкі, праз Атлянтыцкі акіян, пасоўваюцца да Эўропы. Попел пачынае ападаць і ў Эўропе.

Да нас пішуць.

НАШЫ БЕДЫ І ПРАЦА Ў ГАРОТНЫМ ЖЫЦЬЦІ.

В. Бухаўшчына Нясьвіскага пав. Прад выбарамі ў Сойм 1930 году, як ужо пісалася ў „Б. Крыніцы“, нашай вёсцы абяцалі даць дзерава на будоўлю, бо наша вёска ў 1920 годзе пагарэла, а страхоўкі ніхто не атрымаў. Але вось мінае ўжо другі год, а дзерава ніхто не дастаў ані палена. У працягу гэтага часу было толькі паведамленьне, што наша вёска можа дастаць на адбудову дзерава ў Вількоўшчыне, за 20 вёрст ад нас, па абніжачай цане. Калі-ж нашы сяляне туды паехалі паглядзець дзерава і даведацца аб зьніжцы, дык аказалася, што гэтая „зьніжка“ ня нізкая, бо фэст-мэтр цэніцца 18 зл. Пакульшто гэтая абяцанка так і астаецца цацанкай. Многія яшчэ і да гэтай пары не адбудаваліся ад пажару, хоць ужо прайшло 10 гадоў.

У нашай гміне (Лань) як і ва ўсіх гмінах ёсьць гмінная рада, але што б яна ня „радзіла“, усё можа скасаваць і вельмі часта касуе паветавая ўлада. Сколькі паветавая ўлада не зацьвердзіла выбраных гміннай радай войтаў, дык і палічыць трудна. Словам, гмінай кіруе не мяйсцовы самаўрад, а паветавая ўлада. А гэта таму, што маем такую самаўрадавую ўставу (закон), якая дазваляе існаваць самаўраду, але кіраўніцтва ў самаўрадзе аддае паветаваму старасьце. Незважаючы аднак на гэта, нам беларусам самаўрадавым жыцьцём трэба цікавіцца і як мага дамагацца на тэрэне самаўраду сваіх правоў.

Дзякуючы стараньням некалькіх асоб, у нас час ад часу ладзяцца беларускія прадстаўленьні. Адно такое прадстаўленьне было 14 лютага, а другое 13 сакавіка сёл. г. На першае прадстаўленьне цёмныя сілы пробавалі зрабіць напад, страшачы моладзь пабоямі, але ня ўсе гэтых дурных пастрашак пабаяліся. На другое прадстаўленьне гэтыя цёмныя сілы ўжо самі ўспакоіліся і ўсё адбылося добра.

Шкода, што наша моладзь да гэтай пары не патурбавалася заложыць сваей беларускай арганізацыі А трэба мець сваю арганізацыю, а пры арганізацыі — бібліятэку-чытальню. Тады і праца пашла-б лягчэй.

Зорка.

AB PARADKACH U NAS I AB NAŠYM ŽYĆCI.

Ješkawičy, Niaświskaha paw. Jość u nas hurtok Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury. U hetaj našaj arhanizacyi pierawažna moładź. A moładź naša wielmi achwočaja da pracy na rodnaj biełaruskaj niwie. Biada adna, što niama kamu razumna i dobra pakirawać našaj moładziaj. Ale jana i sama, choć samatuham, biarecca da raboty.

Naša moładź, jašče zimoj, uplanawała sabie, kab zładzić 12. III. s. h. biełaruskaje pradstaŭleńnie. Nawučyłasia z knižki sceničny twor, pryhatawała scenu na pradstaŭleńnie i pačała prasić ułady dazwołu na spektakl. Napisali prośbu ŭ starastwa i pajechali ŭ pawiet prasić dazwołu. Pieršy raz u starastwie skazali, što ŭ toj čas nia było kamu wydać hetaha dazwołu. Pajechali druhi raz. Druhim razam skazali, što dazwoł pryšluć u hminu. Pačakaŭšy, pajšli ŭ hminu. U hminie skazali, što nijakaha dazwołu niama ad starastwa. Zajšli zapytacca na pastarunak palicyi, a tam skazali, što jak niama dazwołu, dyk niama i pradstaŭleńnia. Takim čynam usia sprawa ŭ hetaj wałakicie i zahrazła.

Za padatki ŭ nas apisywajuć haspadaroŭ u wioscy pahałoŭna ŭsich.

Nadowiačy pryjechaŭ u našu wiosku sekwestratar, uziaŭ u pomač sabie sołtysa i pačaŭ apisywać, pačynajučy z kanca wioski. Pakul było świetła, usio apisywali; a apisywali pierawažna žywiołu. A jak pryšoŭ wiečar, dyk treba było addychnuć i sekwestrataru. U tuju chatu, dzie zatrymaŭsia sekwestratar, zyšlisia i sialanie. Adny prynosili chto kolki mieŭ paŭzałatowak, kab wykupić ad apisu ciałušku, abo padświnaka, a inšyja, što nia mieli čym wykuplać swaich apisanych świnak, pryšli ab sim ab tym papytacca ŭ sekwestratara i pahawaryć z susiedziami. U hutarkach pačali niekatoryja chwalicca, dzie chto byŭ i što rabiŭ. Adzin pačaŭ raskazywać, jak jamu było dobra, kali jon służyŭ daŭniej u rasiejskim flocie. Kawal uspaminaŭ lepšyja časy, kali jon i ŭ swajej wioscy ŭ kuźni zarablaŭ, inšy chwaliŭsia, što jamu lepš było ŭ dware

---

наму калгасьніку вызначаецца пэўную рэч або пэўную частку калгаснае маемасьці, каб ён яе пільнаваў і быў за яе адказны. Аднаму каровы, другому коні, трэцяму машыны, чацьвертаму сьвіньні, пятаму парасяты і г.д. Сяляне, пачуўшы аб гэтакім новым парадку, пачалі дзяліць усім калгасную маемасьць паводле таго, як было даўней: конь быў мой, я яго буду і дагледаць, карова была мая, я яе і бяру на свой адказ, поле было маё, я цяпер буду яго і абрабляць... Пачуўшы аб такіх „дробна-буржуазных“ імкненьнях сялянства, савецкія ўлады забаранілі гэтак рабіць, баючыся, каб ізноў не вярнуўся стары парадак, абапёрты на прыватнай уласнасьці і загадалі даглядаць тых рэчаў і за тое быць адказнымі, што будзе вызначана савецкімі ўладамі або старшынёю калгасу. Змаганьне з абязьлічкай і заводжаньне адказнасьці ў калгасах за даручаную маемасьць праводзіцца з цэлай рашучасьцяй савецкай уладай, якая такім спосабам мае наладзіць лепшае жыцьцё ў калгасах.

Трэцім спосабам падняцьця гаспадарчай выдайнасьці калгасаў будзе саргенізаваньне *вытворчых брыгад*. Даўней кожны калгасьнік рабіў тое, што яму болей падабалася, або да чаго яго празначылі. Цяпер работа арганізуецца паводле спэцыяльнасьці кожнага сябры ў калгасе: усе калгасьнікі дзеляцца на часткі, якія называюцца брыгадамі; кожнай брыгадзе даецца пэўная часьць працы ў калгасе і так: да араньня адна брыгада, да сяўбы другая, да лёну трэцяя, у гарод чацьвертая, у лес пятая і г. д. У лесе брыгада дзеліцца яшчэ на меншыя брыгады, адна рубае, другая пілуе, трэцяя вывозіць. Бывае так, што брыгадзе вызначаецца вучастак поля на працягу году і гаворыцца: ты вывезеш гной, узарэш, пасееш, забаронуеш, зьбярэш, абмалоціш і здасі ў калгас, а за гэта табе будзе столькі і сколькі працаднёў, а за працадні атрымаеш столькі і столькі прадуктаў. Тут ўжо нешта падобнае да здаваньня ў арэнду вучасткаў зямлі за пэўную часьць ураджаю. Апроч гэтага твoрацца яшчэ *„ударныя“* брыгады, зложаныя з самых заўзятых калгасьнікаў, прадусім камуністаў і камсамольцаў. Ударнікі пасылаюцца туды, дзе аказаўся „прарыў“ у рабоце, або дзе трэба падагнаць лянівых. У брыгадзе, так як у цэлым калгасе, скасавана „ураўнілаўка“ у працы і ў падзеле прадуктаў: той атрымлівае болей прадуктаў, хто выганіць болей „працаднёў“. А каб ня было „ураўнілаўкі“, уводзяцца па ўсіх калгасах кантрольныя і разьліковыя брыгады якіх мэтай ёсьць кантраляваць „працадні“ і выкананую работу. Пры вызначэньні брыгад бываюць у калгасе частыя спрэчкі, бо кожны хацеў бы папасьці ў тую брыгаду, дзе менш работы, або дзе гэта работа лягчэйшая.

Чацьвертым спосабам падняцьця калгаснай гаспадаркі будзе *сьцiслая кантроль над вытворчасьцяй і расходам калгасу.* Калгас ня мае права выдаць нават аднаго фунта хлеба над норму, апрацаваную савецкімі ўладамі і мусіць з усяго вылічыцца. Калгас перадусім мусіць здаць дзяржаве па „цьвёрдых“ цэнах азначаную колькасьць збожжа, бульбы, гароднiны, малака, масла, мяса словам — усіх гаспадарчых прадуктаў. Калгас ня мае права карыстацца з прадуктаў нават на сваю патрэбу і так: ня мае права расходаваць для жывёлы болей корму, чым гэта назначана; ня мае права выдаць прадуктаў людзям, якія ня выгналі належнай колькасьці „працаднёў,“ хоць-бы тыя людзі цярпелі голад; ня мае права зарэзаць цяляці, або іншай жывёлы на сваю патрэбу і г. д. Бывалі выпадкі, што за зарэз цяляці (ужо не гаворачы аб карове) давалі па 4 гады катаргі. Калгас ня мае права прадаць сваіх прадуктаў, пакуль ня здасьць належнай колькасьці дзяржаве (затым такія высокія цэны на вольным рынку). Калгас можа толькі тагды купіць нешта для сябе, калі атрымае ад дзяржавы грошы за зададзеныя прадукты. Куплены тавар (боты, шапкі, адзеньне і ўсе патрэбныя рэчы) раздзяляюцца паміж сябрамі калгасу паводле працадзён. Той-жа калгас, каторы ня здаў нічога дзяржаве, астаецца „гол як сакол.“

З мэтай сьцiслай кантролі, ўведзены ўжо ва ўсе саўгасы (савецкія гаспадаркі) спэцыяльныя дзяржаўныя кантралёры, якія будуць залежны толькі ад Наркамзему (Народнага Камісарыяту Земляробства) СССР. і апавяшчаецца дэкрэтам з 27.XI.31, што *„расходаваньне саўгасамі харчоў і кармоў у размерах, якія перавышаюць установленыя нормы, лічыць крымінальна пакаральным злачынствам* (Зьвязда 30.XI.31) Іншымі славамі, нават перарасходаваньне харчоў ці корму будзе карацца, як крымінальны праступак! Змаганьні з гэтак званымі „спажывецкімі“ і „вацкімі“ настроямі ёсьць, паводле савецкай прэсы, аднэй з галаўнейшых задач дзеля умацаваньня калгаснай гаспадаркі.

(д. б.)

służyć parabkam, jak ciapier być haspadarom. Niekatoryja prypomnili, jak służyli ŭ carskaj armii, jak karmili ich z adnaho katła. Ale ŭsie narakali adnačasna na žyćcio ciapierašniaje.

U hetym času ŭwachodziać u chatu dwuch palicejskich i dawaj rabić dapros. Adzin palicejski dawaj pytacca: chto kazaŭ, što budzie tady dobra, jak budziem z adnaho katła jeści? chto kazaŭ, što tady budzie dobra, jak budzie ŭ dwarе kamisaram?... Apriača hetkich pytańniaŭ, palicejski niešta hawaryŭ ab lampie i jašče ab niečym, a paśla niešta napisaŭ i palicyja pakinuła našych wiaskoŭcaŭ azadačanych. Adny kažuć, što palicyja śpisała pratakoł, jak na kamunistaŭ, druhija ćwierdziać, što pa hetym pratakole budzie sud, a čaho palicyi treba było, dyk i nichto nia wiedaje.

Słowam, ciomnyja našy sialanie, treba im światła. Palicyja i sekwestratary nie praświeciać našaj wioski. Dyk treba Tabie, darahaja moładź, bracca za hetu rabotu. Wypisywaj swaje hazety, knižki, čytaj sama i starejšych zaachwočywaj čytać.

M. B.

КРЫХУ АБ НАШАЙ ГМІННАЙ РАДЗЕ.

Будслаў, Вялейскага пав. У нас ходзяць чуткі, што скора маюць адбыцца выбары ў гмінныя самаўрады. А варта было-б абнавіць працу ў самаўрадзе гмінным. Прыкладам склад нашай гміннай рады — гэта слухачы войта. Што войт скажа, так і павінна быць. Усе радныя падлягаюць войту:— адзін мае стрэльбу, а каб яе не адабралі — слухае, другі дзеля чаго іншага і так усе. У цяперашняй нашай гміннай радзе ёсьць толькі адзін радны, які стойка бароніць сялянскай справы. Але што ж адзін значыць?

Дык вось у наступных выбарах трэба выбіраць людзей стойкіх і практычных гаспадароў.

Селянін.

З Вільні.

Віленскія студэнскія проціўжыдоўскія разрухі прад судом. Дня 15 і 16 г.м. у Віленскім акружным судзе разглядалася судовая справа абвінавачаных жыдоў за проціўжыдоўскія студэнскія разрухі ў Вільні ў м-цы лістападзе мін. г. — Залкінда, Огуза і Вульфіна. Гэтыя жыдкі былі абвінавачаны так-жа і за забойства ў разрухах студ. Вацлаўскага. На расправу было паклікана 60 сьведкаў. Суд Залкінда і Огуза апраўдаў, а Вульфіна засудзіў на 2 гады турмы за ўчасьце ў разрухах.

Вясельле „бесаў" у царкоўнай званіцы.

(„Голас Праваслаўнага Беларуса № 3. Вільня. Студзень-люты-сакавік 1932).

Усе тыя мэты і акцыя, дзеля якіх гэты „Голас" створаны і характэрыстыка людзей, якія маральна і фактычна ім кіруюць, сапраўды нагадвае нам „вясельле бесаў у царкоўнай званіцы".

Часопісь гэта мае прэтэнсіі быць органам такіх „праваслаўных" людзей, як А. Луцкевіч, Р. Астроўскі і як выканаўца іх, якога не бяз слушнасьці ў Вільні завуць Луцкевічаўскім ад'ютантам, расеец, чалавек з Царквой ня маючы нічога супольнага, Владимір Иванович Самойло.

Вось-жа гэта кучка людзей, што „будуе" Праваслаўную Царкву ў „Голасе Прав. Беларуса" — гэта сапраўды супалка, маючая сабе за мэту развальваць Царкву, зарабляць, калі дасца, на яе няшчасьці і зводзіць асабістыя рахункі з людзьмі, якія знаюцца на іх „праваслаўі", асабліва-ж з сьвяшч. А. Каўшом, які пазнаўся на іх і іх пакінуў.

Людзі гэтыя ў працы сваей падшукалі так-жа для сябе пару асоб і з праваслаўных віленскіх сьвяшчэньнікаў, па духу яўных маскоўцаў, якія ахвотна пашлі ім на падмогу і на супрацоўніцтва на грунце барацьбы з тым-жа сьвяшч. А. Каўшом, з якім яны маюць асабістыя разрахункі і якога ненавідзяць, як адзінага сярод іх праваслаўнага сьвяшчэньніка беларуса, які адзіны ня крые сваей беларускасьці, але яе нават маніфэстуе.

Але бліжэй да зьместу „Голасу". Сапраўды добрае ўражаньне робіць першы артыкул гэтай часопісі, які сусім слушна распраўляецца з яўна варожай да беларускага народу пастановай Зьезду прав. духавенства Віл. эпархіі 1—3 сакавіка сёл г. Але-ж гэты артыкул — гэта фікцыя, гэта маска прад беларускім грамадзянствам і народам, бо-ж выдаўцы і рэдактары „Голасу Прав. Беларуса" іменна ў супалцы з тымі праваслаўнымі сьвяшчэньнікамі, якія прынамся духам — чысьцейшыя расейцы, што ахвотна ўрэшце службу цару мяняюць на службу польскаму ўраду, якія іменна і правялі на эпархіяльным Зьезьдзе гэную варожую для беларусаў пастанову.

Далей ідзе артыкул аб Царкоўным Саборы — паважны сваім настроем, але даволі імглісты і з дамешкай цалком незразумелай наіўнасьці. Між іншым у гэтым артыкуле чытаем: „пераможа на Саборы заўсёды адно — гэта Дух Божы"... Вось-жа, каб так было на Саборы сапраўды, шмат дзеля гэтага трэба споўніць варункаў. Мы згары пераканаμы, што на Царкоўным Саборы, які быццам, ведама, не без „апекі" польскай палітыкі, мае быць склікаvы ў Варшаве, а да якога імкнецца і „Голас Прав. Беларуса", як найменш будзе мець іменна гэнага Сьв. Духа.

Рэшта „Голасу", аж 22 балонкі, пасьвячана выключна ярым нападкам прадусім на сьвяшч. А. Каўша, на БХД, на іншых асоб і... безгранічнаму самахвальству. Чытаць гэта ўсё ня кожны патрапіць, бо робіцца моташна. Мы ўсё гэта сьмяцьцё прапускаем і толькі затрымаемся на нападках „Голасу Прав. Бел." на „Бел. Крыніцу" і на БХД у „Аглядзе прэсы". Вось-жа прадусім мусім адкінуць ілжывы данос пісакі з „Гол. Прав. Бел." на бел. ксяндзоў, што яны быццам кіруюць БХД, а якія, як ведама, дзеля забароны польскага каталіцкага Віленскага Арцыбіскупа, да БХД ня належаць. Мусім так-жа яшчэ раз, лішні раз, сьцьвердзіць ведамы факт, што БХД не выключна каталіцкая арганізацыя, думку аб чым падсовывае чытачом „Гол. Пр. Беларуса", але разам і праваслаўная. У Цэнтральны К-т БХД уваходзяць: як старшыня — інж. А. Клімовіч, каталік і два праваслаўныя заступнікі старшыні, выпрабаваныя і заслужаныя беларускія сялянскія дзеячы: Якім Красоўскі і М. Дварэцкі.

Абражаюцца ўрэшце на нас „царкоўнікі" з „Голасу Прав. Бел." за тое, што мы іх работу называем „бесаўшчынай", а не называем гэтак работы іхных конкурэнтаў на царкоўнай ніве — Т. Вярнікоўскага і В. Більдзюкевіча. Прызнаёмся, што тут наш недагляд, які на гэтым мейсцы папраўляем, цьвердзячы, што як Вярнікоўскі з Більдзюкевічам, так і Луцкевіч з Астроўскім і з Самойлам, дзеля іхнай вартасьці, як *царкоўных* дзеячоў, усе варты адзін другога і як адных, так і другіх „царкоўная" праца, гэта сапраўды „вясельле бесаў у царкоўнай званіцы".

Дык дасьпеў вялікі час, каб праваслаўная фракцыя БХД, дзеля дабра сваей Царквы і свайго народу, арганізавала выдавецтва беларускай праваслаўнай, хоць бы невялічкай, часопісі і пачала прачышчаць так засьмечаную рознымі безадказнымі адзінкамі, беларускую Хрыстову ніву царкоўную.

Сяргей Цітовіч.

W. A. 11)

Kaniok-Harbuniok.

VII.

Padlez Janka šyta—kryta
Pad dubowaje karyta.
Tolki što pačnie dramać,
Pačało užo świtać.
Až adkul dy što biarecca?
Stada ptušak tudy precca.
Woś zakryli ceła nieba —
Tut i sonca nie patreba!
Swieciać ptuški jak-by dniom,
Prosta buchajuć ahniom.
Na pšanicu jak pasieli,
Łasawali, jak chacieli.
Winom ježu zapiwali
I kryčali i śpiawali...
Janka doŭha pryhladaŭsia,
Tak i hetak mierkawaŭsia;
Ale wielmi to-ž baicca,
Kab tut jak nie pamylicca.
Samu lepšu zławić choča.
Woś-ža Janka jak padskoča —
Chłapiec budučy nia prost,
Cap Žar-ptušku, dyj za chwost!
Jana stała trapiatacca,
Dyj kusacca, dyj brykacca;
Joj druhija pamahali —
Čuć Iwana nie sklawali.
Ale jon chłapiec nia prost,
Učapiŭšysia za chwost,
Dziaržyć ptušku, dyj kryčyć.
Harbuniok tut prybiažyć;
I abodwy, jak ŭzialisia,
Całaj stadzie nie dalisia.
Inšych dobra napužali,
Hetu u miašok schawali —
Byŭ naš Janka wielmi rad.
I pajechali nazad.
Kniaź, pryniaŭšy ich prychilna,
Raspytaŭsia wielmi pilna
Ab usim: hdzie, što i jak?
Skazaŭ: „Janka — nie durak!
Piać rubloŭ haścinca daŭ,
I ministru zahadaŭ,
Kab Iwanu mała-mnoha
Tytuł dać na „stremiannoha".

VIII.

Janka rady — čuć nia skača,
A toj spalnik čuć nia płača.
Toj što Janku dumaŭ drenna,
Što zawidywaŭ strašenna.
Janka śpić sabie biaśpiečna —
Spalnik sumny bieskaniečna;
Janka jeść i miod i sała;
Spalnik sochnie — jamu mała:
Jamu zajzdraść hryzie serca,
Jamu miod harčej ad piercu.
Spalnik k' kniaziu prybiahaje
I na Janku baje, baje...
Što jon... heta, inša, toje...
Samahorša i błahoje.
I jak staŭ jamu wywodzić,
Pleści, łhać i waławodzić,
Što kniaź słuchaŭ, čmychaŭ, dźmuchaŭ,
Až patylicu pačuchaŭ.
Špalnik pośle na astatak
Jašče wydumaŭ dadatak,
Što Iwan chwaliŭsia, kaža,
Štuku lepšuju dakaža:
„Hłupaść, kaža, dastać ptušku,
Ci tam inšu fintiflušku!
„Ja pajedu zahranicu,
Złaŭlu, kaža, tam Carycu,
Što na świecie nia čuwana,
Tolki ŭ baśni apisana."
Kniaź pačuŭ, až zadziwiŭsia;
Zara ŭ sercy zapaliŭsia:
Razahnaŭsia z durna-pjana,
Zahadaŭ šukać Iwana.
Dać zahad Iwanu račyŭ,
A pry hetym-ža adznačyŭ:
„Jedź ty, kaža, zahranicu,
Prywiazi mnie Maładzicu
Niawidanu, niačuwanu,
Tolki ŭ baśni apisanu.
A žywie jana na mory:
Pierajedzieš rečki, hory,
Praz waziory pieraskočyš...
Jedź, kudy sabie zachočaŭ,
Za dziesiatuju hranicu
I zławi mnie Car-dziawicu."
„Što za napaść?"—kaža Janka.
Woś spali mianie małanka,
Kali ja kamu chwaliŭsia!
Kniaź, ty wielmi pamyliŭsia:
Ja nia znaju toj ziamlicy.
I nijakaj tam Carycy
Ja nia bačyŭ i na wočy.
Prysiahaju prociŭ nočy...
„Što, ty chočaš jašče sporyć?
Čuješ, kniaź tabie haworyć!
Skažy tolki adno słowa —
Pasiaku ciabie na drowa!
Sabirajsia u darohu;
Dyj za toje dziakuj Bohu,
Što žywy jašče astaŭsia.
Dźwie niadzieli—bolš nia baŭsia.
Času maješ wielmi mnoha,
Tak-ža wiedama daroha:
Prosta jedź, kudy patreba —
Ci na ziemłu, ci na nieba,
Z toj Carycaj waračajsia.
A jak nie, dyk raźwitajsia
Z swajej bujnaj hаławoju.
Klanuś hetaj baradoju!"
Janka z płačam i lamentam
Lacić ŭ stajniu tym mamentam:
Jak Kańku na šyju paŭ,
Caławaŭ i abymaŭ...
Kaža: „Zhinu, prapadaju!
Dawaj radu, bo nia znaju,
Što rabić, kudy padacca,
Jak za hetu sprawu bracca?
Kaniok słuchaŭ, wažyŭ dzieła.
Kaža: „Piena nakipieła!
Pračuwaŭ ja hetu štuku;
Maješ dobruju nawuku,
Što-to značyć panska łaska:
Taja-ž łaska, jak kalaska,
Kruć i wierći tut škoda, psota—
Ŭsadziać durnia u bałota.
A z toj kniaziawaj haworki
Bačym, što pačatak horki,
Dy harčejša budzie hušča:
Serca hniazia zawidušča...
Duša čuje, bačyć woka,
Što kaniec jašče daloka.
Tolki ž, Janka, miły bracie,
Bolš nia budziem narakaci:
Ale rezwa, chutka, śmieła,
Družna woźmiemsia za dzieła!
Jak dastali Žar-kurycu,
Złowim tuju Car-carycu".

(*d. b.*)

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.